ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ: УСКОЧЫЦЬ У АПОШНІ ВАГОН 3

РАЙСКІ КУТОК СВАІМІ РУКАМІ 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЧЭРВЕНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 101 (29470)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:

«Сёння мы можам з упэўненасцю казаць, што прадпрымальніцтва ў Беларусі адбылося. Малы і сярэдні бізнес уносяць сур'ёзны, істотны ўклад у развіццё эканомікі краіны. Гэта апора для нашай дзяржавы. Гэта амаль 32 % эканамічна занятых людзей — значная эканамічная сіла для развіцця нашай краіны. 35 % падаткаў — гэта таксама прадпрымальнікі, 30 % валавой дабаўленай вартасці, 31 % экспарту тавараў і 40 % экспарту паслуг. Таму нам ёсць чым ганарыцца, ёсць вынік, і мы вас будзем падтрымліваць, у першую чаргу вытворчы бізнес. Міністэрства эканомікі ў гэтым кірунку актыўна працуе».

КАРАТКА

- **Наталля Качанава сустрэлася з прадстаўнікамі абласных Саветаў дэпутатаў.**
- БРСМ запрашае моладзь прыняць удзел у шостым сезоне рэспубліканскага фотаконкурсу «Сэлфі & фота з вышыванкай», які стартуе ў Беларусі 1 чэрвеня.



- **Мінскі маторны завод паставіць у Пакістан 1,5 тысячы рухавікоў.**
- Дзяржаўны пагранічны камітэт: часовы від на жыхарства не з'яўляецца падставай для выезду за мяжу.
- **Знешні дзярждоўг у студзені—красавіку зменшыўся на 2,5 % — да $18,1 млрд.**

З нагоды

Каб была дзецям радасць

Напярэдадні Міжнароднага дня абароны дзяцей у Мінску адбылася дабрачынная акцыя для выхаванцаў сацыяльна-педагагічнага цэнтра Цэнтральнага раёна: дзяцей пакаталі на цеплаходзе па Свіслачы.

Фота Belta.

У краіне распачаліся святочныя мерапрыемствы з нагоды Міжнароднага дня абароны дзяцей

На базе Рэспубліканскага рэабілітацыйнага цэнтра для дзяцей-інвалідаў дадзены старт рэспубліканскай акцыі «Сонечны круг». Пад акампанемент Прэзідэнцкага аркестра выступілі падапечныя Беларускага дзіцячага фонду, а выхаванцы цэнтра прадставілі фрагмент практыкавання на музычнай нейрагімнастыцы. Гасцей сустракалі танцавальным флэшмобам «Гэта планета дзяцінства», а ўсе наведвальнікі пазнаёміліся з фотавыстаўкай дзіцячых фатаграфій «Свет дзяцінства» і выстаўкай дэкаратыўна-прыкладной творчасці дзяцей.

Установы аховы здароўя Гродна, Гомеля, Магілёўскай вобласці і Мінска атрымаюць медыцынскае абсталяванне. Для дзяцей са шматдзетных сем'яў, выхаванцаў дамоў сямейнага тыпу і дзяцей-інвалідаў будуць арганізаваны экскурсіі па гістарычных мясцінах Беларусі.

А 1 чэрвеня ў 12.00 у дзіцячых стацыянарных установах аховы здароўя Мінска стартуе прыгожы флэшмоб з удзелам тых, хто навучаецца ва ўстановах адукацыі горада, пры падтрымцы Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Дзецям перададуць лісты падтрымкі «Дзеці, мы побач» і салодкія падарункі. Вынікам акцыі стане правядзенне дыялогавай пляцоўкі на базе Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

У першы дзень канікулаў забаўляльную праграму «Топавае лета» падрыхтаваў Мінскі заапарк. Імпрэза пачнецца ў 13.00. Юных і дарослых наведвальнікаў чакаюць папяровае шоу і танцавальны драйв «Мы ў ТОПе», гульнявая праграма «Лета прыгожае і бяспечнае», шоу мыльных бурбалак, інтэрактыўныя пляцоўкі і майстар-класы. І, вядома, зарад бадзёрасці і добрага летняга настрою на свежым паветры падарыць запланаваныя паказальныя кармленні насельнікаў заасада. На кантактнай пляцоўцы «Вясковая сядзіба» можна пагладзіць хатніх авечак і казачак, Адкрыты пастаянныя экспазіцыі, працуюць атракцыёны, кафэ, можна пакатацца на кані або поні.

Непасрэдна ў Міжнародны дзень абароны дзяцей для бацькоў правядуць кансультацыі ў натарыяльнай канторы № 3 Маскоўскага раёна Мінска. Тут усіх ахвотных бясплатна пракансультуюць па здзяйсненні натарыяльных дзеянняў у сферы шлюбна-сямейных адносін і абароны правоў дзяцей. У гэты ж дзень дыстанцыйна сталічныя натарыусы далучацца да акцыі галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінгарвыканкама «Дзень бясплатнага кансультавання сем'яў, якія выхоўваюць непаўналетніх дзяцей». Адказы на пытанні, звязаныя з правядзеннем натарыяльных дзеянняў, можна атрымаць з 10.00 да 13.00 па тэлефонах: 8044 554-42-70 і 8017 351-04-90.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Будзьце здаровыя

ДЛЯ ЖЫЦЦЯ БЕЗ БАР'ЕРАЎ

Спецыялісты — пра падтрымку інвалідаў і магчымасці рэабілітацыі

У Беларусі 564 тысячы чалавек маюць інваліднасць, а гэта каля 6 % насельніцтва. Яшчэ дзесяць гадоў таму лічба была меншай — каля 500 тысяч. Паступовае павелічэнне гэтай катэгорыі спецыялісты тлумачаць тым, што з'яўляюцца новыя метады лячэння і рэабілітацыі, якія дазваляюць выратаваць жыцці многіх дзяцей і дарослых, што раней было немагчымым, а таксама падоўжыць працягласць жыцця людзей з інваліднасцю. Пра сацыяльныя гарантыі для інвалідаў і магчымасці рэабілітацыі расказалі эксперты.

Сацыяльныя гарантыі

— Сацыяльная абарона людзей з інваліднасцю з'яўляецца адным з прыярытэтаў дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі. Інвалідам гарантавана сацыяльная падтрымка ў выглядзе грашовых выплат — пенсій, дапамог, дзяржаўнай адраснай дапамогі, аказання сацыяльных паслуг, забеспячэння тэхнічнымі сродкамі рэабілітацыі, — кажа **начальнік упраўлення па справах інвалідаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вікторыя ГРАЧЫХА.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Уладзімір МАКЕЙ:

«ПЕРАКАНАНЫ, ШТО СЁННЯ БОЛЬШАСЦЬ НАРОДА ЗГУРТУЕЦЦА Ў ДАДЗЕНАЙ СІТУАЦЫІ І БУДЗЕ ПАДТРЫМЛІВАЦЬ СУВЕРЭНІТЭТ, НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ І САМАСТОЙНАСЦЬ»

Пераважная большасць беларусаў будзе стаяць да канца, але не падпарадкуецца дыктату ў дачыненні да сваёй краіны. Пра гэта міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей заявіў у інтэрв'ю расійскаму выданню «Камерсант», паведамляе БелТА.

«Мы вельмі сур'ёзна ставімся да заяў пра тое, што плануецца чацвёрты пакет санкцый супраць шэрагу адчувальных галін нашай эканомікі. Будзем рэагаваць на гэтыя рэчы, каб нівеліраваць санкцыі. Не магу цяпер гаварыць, якія гэта будуць меры, але ў нас ёсць вялікі вопыт жыцця пад санкцыямі, мы бачым, як некаторыя краіны і сёння жывуць пад санкцыямі, узяць той жа самы Іран, узяць эканамічную блакаду Кубы. Не хацелася б, каб абстаноўка і далей нагнятałася, але мы лічым, што ў гэтай сітуацыі трэба выстаяць», — сказаў Уладзімір Макей.

Па словах міністра, ён даносіў гэтую пазіцыю заходнім калегам, але ў іх «няма такога адчування, што ў Беларусі гатовыя ісці да канца, каб адстаяць незалежнасць і суверэнітэт дзяржавы». «Праз санкцыі, праз спробы падтрымаць апазіцыю яны спрабуюць разбурыць нашу эканоміку, і гэта можа прывесці да знішчэння дзяржаўнасці краіны. Яны павінны выразна разумець гэта. Яны думаюць, што далейшае пагаршэнне эканамічнай сітуацыі прывядзе да таго, што народ выйдзе на вуліцы і змяце цяперашнюю ўладу. Катэгарычна не згодны. Перакананы, што сёння большасць народа згуртуецца, наадварот, у дадзенай сітуацыі і будзе падтрымліваць суверэнітэт, незалежнасць і самастойнасць у знешняй, ва ўнутранай палітыцы насуперак вось гэтаму ціску. Перакананы, што пераважная большасць людзей будзе гатовая стаяць да канца, але не падпарадкуецца таму дыктату, які зараз адбываецца ў дачыненні да Беларусі», — заявіў дыпламат.

На думку міністра, калектыўны Захад «вельмі нервуецца з нагоды таго, што свет становіцца шматпалярны, што з'явілася шмат буйных геапалітычных гульцоў, з меркаваннем якіх трэба лічыцца».

«Я згодны з маім калегам Лаўровым, які сказаў, што свет перастаў быць захадацэнтрычным. Пяцьсот гадоў Захад дыктаваў нам умовы, як жыць, што рабіць, па якіх правілах развівацца. Сёння з'явіліся буйныя геапалітычныя гульцы: Кітай — адна з найбуйнейшых эканомік свету, Індыя, якая актыўна развіваецца, Расія зняла руковыя акуляры, якія ў яе былі ў 1990-я і ў пачатку 2000-х гадоў, устала з каленяў і рэальна бачыць, што з сябе ўяўляе Захад», — сказаў Уладзімір Макей.

Ён адзначыў, што Расія таксама адна з вядучых сусветных дзяржаў, пры гэтым — ядзерных дзяржаў. «Гэта не падабаецца шмат каму на Захадзе — страта свайго аўтарытэту. Робяцца дзеянні з тым, каб усё-ткі ўмацаваць свой лагер. Сітуацыя ў Беларусі — вынік таго, што мы апынуліся на геапалітычным разломе, і Захад нас спрабуе перацягнуць на свой бок, дыктуючы свае ўмовы. Мы ж лічым, што адносіны павінны развівацца на тых прынцыпах, якія выпрацаваны ў Статуце ААН, і менавіта гэта — аснова пабудовы нармальнага справядлівага свету. На жаль, Захад спрабуе дзейнічаць метадамі прымусу, ціску, санкцый», — падкрэсліў кіраўнік беларускага МЗС.

«Сёння ў нас з Расіяй засталіся толькі дзве саюзныя праграмы з 28-і. Гэта — фарміраванне агульнага рынку газу і гарманізацыя падатковага заканадаўства. Мы вельмі істотна прасунуліся і ў плане падрыхтоўкі гэтых дзвюх праграм. Калі раней адхілялася ідэя падрыхтоўкі саюзнай праграмы па ўдасканаленні падатковага заканадаўства, то цяпер ідзе спакойная, планамерная работа па гарманізацыі падатковага заканадаўства», — лічыць Уладзімір Макей.

Важнай мэтай для дзвюх краін Уладзімір Макей назваў стварэнне агульнай эканамічнай прасторы. «Існуюць нейкія парадаксальныя рэчы, калі мы ў нашых краінах ствараем дублюючыя вытворчасці, якія з'яўляюцца канкурэнтамі адзін да аднаго. Трэба дамовіцца аб сумеснай рабоце на рынках нашых краін і на рынках трэціх краін і аб'ядноўваць намаганні. У саюзных праграмах гаворка ідзе менавіта пра тое, каб была выпрацавана агульная палітыка ў той ці іншай сферы, якая дазволіла б нам эфектыўна супрацоўнічаць на двухбаковай аснове і эфектыўна працаваць партнёрамі з трэцімі краінамі», — адзначыў ён.

Каментуючы рэакцыю еўрапейскіх лідараў на пасадку самалёта Ryanair у Мінску, якія назвалі дзеянні беларускага боку тэрарызмам, Уладзімір Макей заявіў: «Баюся, што гэта мэтанакіраваныя дзеянні, каб ператварыць Беларусь і яе кіраўніцтва ў краіну-ізгоя, цалкам развязаць сабе рукі і прыступіць да татальнага ўдушэння эканомікі краіны і дзяржавы».

Міністр адзначыў, што навешванне ярлыкоў апошнім часам у цэлым стала вельмі модным. «Мы бачым гэта ў дачыненні да Расіі: яе кіраўніцтва абвінавачваецца ў здзяйсненні нейкіх антычалавечых злачынстваў. Няхай гэта будзе на іх сумленні», — сказаў ён.

Паводле слоў Уладзіміра Макея, часам вакол радавых выпадкаў заходняя краіны падымаюць вэрхал, і ён заўсёды палітычна матываваны. «Для нас гэта абсалютна непрымальна», — падкрэсліў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства.

Уладзімір Макей выказаўся пра заявы Еўрасаюза фінансава падтрымаць развіццё дэмакратыі ў краіне. «Апаненты ўлады, якія знаходзяцца за мяжой, збеглыя апаненты, кажуць, што Еўрасаюз ужо падрыхтаваў 3 млрд еўра для Беларусі. Прэзідэнт, выступаючы ў парламенце, сказаў, што пра гэтыя мільярды мы чуем яшчэ з 2010 года. Тады, па-мойму, нам абяцалі 5 млрд еўра, але цяпер лічба трохі зменшылася. Не відаць было і тых 5 млрд, і гэтыя 3 млрд, якія нібыта ўжо ляжаць у сейфах ЕС для пабудовы новай дэмакратычнай Беларусі — не тая лічба, якая можа радыкальна змяніць сітуацыю ў дзяржаве. Гэта малая доля ў нашым экспарце», — звярнуў увагу Уладзімір Макей.

«Сёння, назіраючы, як развіваецца сітуацыя ў нашым рэгіёне, ды і ў свеце ў цэлым, назіраючы рост канфрантацыі па ўсіх напрамках, можна канстатаваць, што мы скочваемся да этапу «халоднай вайна 2.0». Калі будзе адбывацца вось гэтае вось нагрувашчванне ўзаемных абвінавачанняў у адрас адзін аднаго, прычым абвінавачанняў сапраўды такіх разбуральных, як гэта было зроблена тым жа самым прэзідэнтам Байдэнам, можна меркаваць, што так мы апынёмся ў кроку ад вайны гарачай», — сказаў Уладзімір Макей.

Ён заўважыў, што на заходнім флангу адбываецца усямернае ўмацаванне ваеннага патэнцыялу блока НАТА і ваеннага патэнцыялу саюзнікаў Беларусі. «Калі раней гаварылася, што сілы НАТА або амерыканскія кантынгенты будуць знаходзіцца там на часовай аснове, то цяпер усё ідзе да таго, што ў прыбалтыйскіх дзяржавах, у Польшчы гэтыя кантынгенты будуць размешчаны на пастаяннай аснове, прычым на найбліжэйшай адлегласці ад граніцы — 10—15 км», — дадаў міністр.

Меркаванне

А КАРАВАН РУШЫЦЬ...

Гэтую навіну інакш як чарговым прыступам вар'яцтва ў межах «вясновага абвастрэння» не назавеш. Паколькі логіцы і здароваму сэнсу яна проста не паддаецца. Літва абвясціла аб выхадзе з фармату супрацоўніцтва «17 + 1», у рамках якога краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ўзаемадзейнічаюць з Кітаем. Як вядома, маштабная платформа існуе з 2012 года і мае на мэце развіццё ўзаемавыгадных праектаў у межах транснацыянальнай глабальнай ініцыятывы «Пояс і шлях», вылучанай Паднябеснай.

Агульны аб'ём інвестыцый вылічваецца астранамічнымі сумамі. На першапачатковым этапе доля Літвы — каля 1,3 мільярда доларaў. Гэта меркаваныя інвестыцыі ў развіццё інфраструктуры — партоў, аўтамагістраляў і чыгункі, тэлекамунікацыйных сетак і аэрапортаў. Не варта таксама забываць і пра неабсяжныя магчымасці кітайскага рынку. Літва актыўна супрацоўнічала з Паднябеснай, паколькі бачыла ў гэтым гістарычную перспектыву. Аднак, як заўважыў галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута Еўропы РАН Міхаіл Мяжэвіч, «гэтай краіне проста паказалі яе месца. Літва не мае сваіх інтарэсаў. У яе ёсць інтарэсы ЗША. Менавіта іх яна павінна забяспечваць у сваёй знешняй палітыцы».

Заакіянскіх партнёраў Вільнюс задаволіў, а вось Паднябесную раззлаваў. «Дзеянні Літвы ў гэтым годзе адпавядаюць выразу «пудзіла гарохавае», але нам не варта выходзіць з сябе па такой дробязнай падставе. Літва занадта малая, а колькасць насельніцтва краіны меншае, чым жыве ў адным раёне кітайскіх гарадоў «першай лініі», — адзначаецца ў рэдакцыйным артыкуле газеты «Хуанцю шыбаа». — Усе яе заявы супраць Кітая маюць толькі сімвалічнае значэнне. Гэта толькі рэха дзеянняў ЗША, накіраваных супраць Кітая. Пакуль Літва паважала нас, мы паважалі яе. Але яна пераацаніла свае сілы і вырашыла справакаваць КНР, таму лепш за ўсё заблакіраваць яе цалкам, зрабіўшы выгляд, што Літвы не існуе зусім. Без Літвы механізм супрацоўніцтва Кітая з Цэнтральнай і Усходняй Еўропай будзе падвяргацца меншаму знешняму ўмяшанню і можа стаць больш прагматычным. Аднак Літве варта трымацца далей ад Кітая».

Чытачы «Хуаньцю шыбаа» ў сваіх каментарыях былі бескампрамісныя. «Гэтая Літва, якая апырскала Кітай такой колькасцю слiны, ужо не ведае іншых спосабаў атрымаць крыху аб'едкаў са стала свайго амерыканскага гаспадара?» — задаўся пытаннем адзін з карыстальнікаў.

Каментатар пад нікам sxiEkE назваў Літву жучком, які кусае небалюча, але потым вельмі моцна свярбіць. Лепш за ўсё раздушыць яго нагой». Многія карыстальнікі параўналі Літву з зярняткам рысу і абвінавацілі ў патуранні ЗША.

Праўда, знайшліся і тыя, хто заклікаў навучыцца аддзяляць улады краіны ад яе народа. «Літоўскі народ катэгарычна не жадае быць пешкамі амерыканскіх і брытанскіх імперыялістаў супраць Расіі і Кітая... Калі будуць зрынуты кіруючыя Літвой рэакцыянеры, усе праблемы будуць вырашаны», — падсумаваў каментатар пад нікам Аазіс у пустыні.

Літва не толькі паставіла крыж на сваіх марах аб мільярдных кітайскіх інвестыцыях і ўваходзе на пажаданы для многіх рынак Паднябеснай. Для Пекіна страта такога партнёра — справа другасная (тым больш што Вільнюс такім чынам чарговы раз яскрава прадэманструе свае «дзелавыя якасці»). Аднак не варта забываць, што сваімі дэмаршамі Літва ўсур'ёз зачапіла Кітай. І засталася за бортам галоўнага сусветнага праекта сучаснасці. Па сутнасці, страціла свой гістарычны шанц. Такія выкрутасы смеху вартыя. Толькі вось простым літоўцам яўна не да смеху.

Пётр ДУНЬКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пасажырскі самалёт Ryanair здзейсніў экстранную пасадку ў Берліне з-за пагрозы выбуху

Самалёт, які накіроўваўся з Дубліна ў Кракаў, на борце якога знаходзілася 160 чалавек, здзейсніў экстранную пасадку ў берлінскім аэрапорце ў нядзелю ў 20.00, паведамляе агенцтва DPA. Супрацоўнікі экстраннай службаў абшукалі самалёт і багаж пасажыраў, але нічога не знайшлі.

Адзначаецца, што прычыны пазапланавай пасадкі і наступнага вобыску самалёта застаюцца няясныя. Раней нямецкія СМІ паведамлялі, што экстранная пасадка была здзейснена з-за інфармацыі пра пагрозу выбуху на борце самалёта Ryanair. Між тым, па даных PIA Навіны, у авіякампаніі Ryanair удакладнілі: экіпаж вымушана сеў у Берліне, рэйс атрымаў паведамленне пра пагрозу ад нямецкіх дыспетчараў і накіраваў судна ў найбліжэйшы аэрапорт.

«Самалёт пасадзілі ў нядзелю, а навіна з'явілася толькі ў панядзелак? Пра здарэнне стала вядома толькі з прэс-рэлізаў кампаніі, а не з дынамікаў НАТА? Ніводнай палітычнай заявы або каментарыя? Ніхто не патрабуе міжнароднага расследавання? Ці можа такое быць пасля тыдня заходніх прыпадкаў на тэму пасадкі самалёта той жа кампаніі пасля аналагічнага інцыдэнту ў Мінску? Вы не разумееце, # ЭтоДругое», — напісала, у прыватнасці, афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава ў сваім акаўнце ў Facebook.

Трудо папрасіў прабачэння за дзеянні Канады падчас Другой сусветнай вайны

Прэм'ер-міністр Канады Джасцін Трудо папрасіў прабачэння ў італьянскай суполкі, якая пражывае ў краіне, за інтэрніраванне іх продкаў падчас Другой сусветнай вайны, піша The Washington Post. «Мы просім прабачэння ў дзясяткаў тысяч ні ў чым не вінаватых грамадзян Канады італьянскага паходжання, якіх назвалі ворагамі, у іх дзяцей і ўнукаў, якія вымушаны былі несці віну», — сказаў Трудо. Па словах палітыка, канадцы італьянскага паходжання дапамаглі стварыць Канаду, яны застаюцца часткай разнастайнасці, якая ўмацоўвае краіну. Ён падкрэсліў, што ўрад «прызнае і ліквідзе гістарычныя памылкі». Італія аб'явіла вайну Канадзе 10 чэрвеня 1940 года, пасля чаго каля 31 тысячы канадцаў італьянскага паходжання былі абвешчаны Атавай «варожымі агентамі». 600 чалавек былі адпраўлены ў лагеры для інтэрніраваных, астатнія страцілі работу і бізнес.

О реализации дебиторской задолженности ООО «КруВиС»

Организатор торгов	Антикризисный управляющий ООО «ЛиквидБай»
Продавец	ООО «КруВиС», УНП 391075890
Форма, дата, время и место проведения торгов	Торги в форме открытого аукциона **02.07.2021 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, оф. 700
Сведения о предмете проведения торгов и его начальная цена	
Лот № 1: ООО «Аморэ миа», УНП 190646123 – 18 457,70 руб. Лот № 2: ИП Багдасарян Норик Фируженович, УНП 691746370 – 8443,36 руб. Лот № 3: ОАО «Глубокский комбикормовый завод», УНП 300019570 – 243 863,95 руб. Лот № 4: ООО «ПМК-224», УНП 192695848 – 66 086,99 руб. По вопросу ознакомления с предметом торгов, дополнительной информации обращаться по тел.: 8044 7945248, 8017 2040494	
Порядок проведения торгов: Шаг аукциона – 5 %. (подробнее – в информации о лоте на сайте https://bankrot.gov.by)	
Размер задатка, сроки приема заявок и порядок зачисления задатка	
Задаток в сумме 10 % от стоимости предмета торгов перечисляется по выбранному лоту в срок по 01.07.2021 на р/с BY67PJCB30120546571000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, получатель – КруВиС», УНП 391075890, назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Задаток должен быть внесен до подачи заявки на участие в торгах. Задаток вносится за каждый лот. Прием заявок с приложением документов осуществляется заказной корреспонденцией в адрес ООО «ЛиквидБай» (220079, г. Минск, а/я 256) либо по e-mail: maruk-73@mail.ru до 16.00 01.07.2021	
Возмещение затрат	Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня проведения
Документы, необходимые для участия в торгах	Заявка на участие в торгах, платежный документ о перечислении задатка; документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах

Прыярытэты

ГАЛОЎНАЕ — ЗДАРОЎЕ ЛЮДЗЕЙ

Пад кіраўніцтвам старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ адбылася нарада з кіраўніцтвам і работнікамі Міністэрства аховы здароўя, прадстаўнікамі медыцынскіх устаноў па пытаннях процідзеяння каранавіруснай інфекцыі, перадае карэспандэнт БелТА.

Як адзначыў, адкрываючы нараду, **міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ,** Беларусь выбрана ў састаў Выканкама Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Гэта значная падзея для краіны. Беларусь была ў Выканаўчым камітэце СААЗ у 1948—1950 гадах і ў складзе Пастаяннага камітэта Еўрапейскага рэгіянальнага камітэта СААЗ у 2013—2016 гадах. «Гэта пацвярджэнне таго, што СААЗ прызнае нашу дзяржаўную палітыку, якая праводзіцца ў сістэме аховы здароўя, у тым ліку і ў рамках эпідэміялогіі», — сказаў міністр.

«Гэта, вядома ж, поспех. Гэта прызнанне работы ўсёй нашай сістэмы аховы здароўя. Гэта агульная заслуга ўсіх медыкаў краіны, таму ўдачы і поспехаў вам у гэтай рабоце і ў далейшым. А мы будзем падстаўляць плячо ўсюды, дзе толькі зможам, таму што здароўе нашых грамадзян для нас самае галоўнае», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Рабочыя нарады па пытаннях процідзеяння каранавіруснай інфекцыі праводзяцца штотыдзень. Дадзеная тэма знаходзіцца на асабістым кантролі спікера верхняй палаты парламента. На сённяшні дзень усе службы дзейнічаюць у штатным рэжыме. Праблемных пытанняў няма. Назіраецца зніжэнне колькасці шпіталізацый хворых на COVID-19.

На асаблівым кантролі — стан шпіталізаваных з кішэчнай інфекцыяй вучняў мінскай школы нумар 66. Як было агучана ў час нарады, іх стан стабільны. Ва ўсіх дзяцей назіраецца станоўчая дынаміка. Яны атрымліваюць неабходную тэрапію.

Прыёмная кампанія — 2021

Паспець ускочыць у апошні вагон...

Сёння завяршаецца рэгістрацыя абітурыентаў для ўдзелу ў ЦТ

У апошні дзень пасля 12 гадзін і да закрыцця пунктаў рэгістрацыі ў 19 гадзін падаць заяву на ўдзел у ЦТ можна будзе толькі асабіста, завітаўшы ў адзін з пунктаў рэгістрацыі. Папярэдняя анлайн-рэгістрацыя на сайце будзе даступная толькі да 12 гадзін 1 чэрвеня.

Усяго ў краіне працуе 41 пункт рэгістрацыі на ЦТ: у Брэсцкай вобласці гэта чатыры ВНУ, у Віцебскай — тры ВНУ і адзін каледж, у Гомельскай — пяць ВНУ і каледж, у Гродзенскай — дзве ВНУ і два каледжы, у Мінскай — тры каледжы, у Магілёўскай — чатыры ВНУ і тры каледжы, у Мінску — трынаццаць ВНУ.

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў нагадваюць, што працэс рэгістрацыі для ўдзелу ў ЦТ лічыцца завершаным толькі пасля атрымання абітурыентам пропускаў.

Прыйсці па пропуск трэба не пазней за 1 чэрвеня. Пры анлайн-рэгістрацыі ў графе «Абраныя прадметы і пункты тэсціравання» ўказваюцца адрасы пунктаў рэгістрацыі, у адзін з якіх неабходна звярнуцца пасля здзяйснення аплаты. Пры сабе трэба мець пашпарт або від на жыхарства, пасведчанне бежанца. Забраць пропускі замест абітурыента могуць таксама яго законныя прадстаўнікі.

Абітурыентам дазваляецца зарэгістравацца не больш як на чатыры дысцыпліны. Пры жаданні можна памяняць прадметы для здачы на ЦТ. Да атрымання пропускаў у асабістым кабінеце можна змяніць даныя ў заяве: набор прадметаў, мову тэсту і г. д. Калі з'явілася неабходнасць гэта зрабіць ужо пасля атрымання пропуску, трэба звяртацца ў пункт ЦТ асабіста. Аднак усе маніпуляцыі можна будзе зрабіць толькі да 1 чэрвеня (уключна).

Выбар мовы, на якой абітурыент жадае здаваць тэсты, ажыццяўляецца яшчэ на этапе падачы заявы і рэгістрацыі на ЦТ. Заява запаўняецца ўдзельнікам ЦТ на адной з дзвюх дзяржаўных моў — беларускай ці рускай на выбар. Трэба мець на ўвазе, што пазней зона рэгістрацыі бланка адказаў будзе запаўняцца абітурыентам на той жа мове, на якой была пададзена заява пры рэгістрацыі. І сертыфікат удзельніка ЦТ будзе запаўняцца таксама на той мове, на якой падавалася заява.

Цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе ў краіне 16 чэрвеня з беларускай мовы. 18 і 19 чэрвеня абітурыенты здаюць тэсты па рускай мове, 21-га — па грамадазнаўстве, 23 і 24 чэрвеня — па матэматыцы і гэтак далей.

Пунктамі рэгістрацыі на ЦТ у рэзервовыя дні і яго правядзення выбраны шэсць устаноў: БДУ, Беларуска-расійскі ўніверсітэт у Магілёве, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. Сухога, Гродзенскі дзяржуніверсітэт імя Я. Купалы. Тэрміны рэгістрацыі абітурыентаў для праходжання цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовыя дні — з 2 ліпеня да 9 ліпеня.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

На слыху

Мініраванне, якога не было

Звесткі аб мініраванні навучальных устаноў не пацвердзіліся. Пра гэта ў сваім Telegram-канале праінфармавала прэс-сакратар МУС Вольга ЧАМАДАНАВА.

Учора на электронныя скрыні дзяржарганізацый (пераважна ўстаноў адукацыі) невядомыя масава разаслалі паведамленне пра небяспеку. Адпаведныя лісты атрымалі 118 мінскіх школ, а таксама ўстановы адукацыі Брэсцкай, Гродзенскай, Магілёўскай, Гомельскай і Мінскай абласцей. Усяго ўстаноўлена больш за 270 адрасатаў, паведамілі ў МУС.

Усе месцы былі абследаваны праваахоўнікамі — інфармацыя аказалася ілжывай. Зараз устанаўліваюць датычных да пагроз.

«Нагадаем, што за загадзя ілжывае паведамленне аб небяспецы прадугледжана крымінальная адказнасць і пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да сямі гадоў», — адзначылі ў МУС.

Мы пагаварылі з бацькамі вучняў, а таксама з настаўнікамі некаторых «замініраваных» школ. Высветлілася, што ўсе нашы рэспандэнты даведаліся пра здарэнне ўжо пастфактум. Напрыклад, у адной са сталічных навучальных устаноў міліцыя праводзіла праверку па факце ілжывага, як стала вядома пасля, паведамлення глыбокай ноччу. У адну са столінскіх школ увогуле ніякіх электронных лістоў з пагрозамі не паступала. Іншымі словамі, у панядзелак урачыстыя лінейкі, прысвечаныя заканчэнню навучальнага года, прайшлі спакойна, без аніякіх эксцэсаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПЕРАКУЛІЛАСЯ БАЙДАРКА З ПАДЛЕТКАМІ

У 10.48 у службу выратавання па тэлефоне «101» паступіла паведамленне аб тым, што на вуліцы Набярэжнай у Гомелі ў раёне пешаходнага моста цэнтральнага парку Гомельскага палацава-паркавага ансамбля на рацэ Сож чацвёра падлеткаў перакуліліся на байдарцы.

Як паведамляе МНС, мяркуецца, падзеі развіваліся наступным чынам: знаходзячыся на трэніроўцы па акадэмічным веславанні, чацвёра падлеткаў ішлі за трэнерам на байдарцы. З-за страты раўнавагі адбылося перакульванне судна, у выніку чаго дзеці апынуліся ў вадзе на адлегласці 50 метраў ад берага (на іх былі выратавальныя камізэлькі). Плынню ракі байдарку, за якую яны трымаліся пасля падзення, прыбіла да апоры моста.

Работнікамі Таварыства ратавання на водах дзеці былі вынятыя з вады і на катары дастаўлены на бераг. Пасля агляду медыцынскім работнікам было ўстаноўлена, што яны не пацярпелі і ў медыцынскай дапамозе не маюць патрэбы. Работнікамі МНС работы не праводзіліся.

Сяргей РАСОЛЬКА.

❍ У тэму

Уладзімір АКУЛІН, інжынер па ахове працы вадалазна-ратавальнай службы Гомельскай абласной арганізацыі Таварыства ратавання на водах:

— Побач з месцам, дзе перакуліліся байдарачнікі, знаходзіцца Гомельская гарадская ратавальная станцыя. Таму сведкамі здарэння сталі яе супрацоўнікі, якія неслі вахту па назіранні за акваторыяй ракі і тэрыторыяй адпачынку на цэнтральным гомельскім пляжы на рацэ Сож.

Супрацоўнікі адрэагавалі на сігнал трывогі, накіравалі ратавальны катар. На месцы здарэння яны адзначылі, што каля апоры пешаходнага моста на вадзе ўтрымлівалася перакуленая спартыўная лодка, за якую трымаліся чацвёра школьнікаў. Гэта вучні восьмага класа СШ № 27 г. Гомеля.

Падлеткаў пасля падняцця на бераг агледзеў медыцынскі работнік ратавальнай станцыі, потым іх перадалі адказным асобам вяслярнай базы, якія і павінны былі сачыць за непаўналетнімі падчас трэніроўкі і забяспечваць бяспеку дзяцей на вадзе.

Звяртаю ўвагу, што на месцы здарэння шырыня ракі дасягае 130 метраў, глыбіня — шэсць метраў. Сітуацыя была небяспечная таму, што дзеці апынуліся ў халоднай вадзе пасля актыўнага веславання, калі цела моцна разагравае-ца. Рэзкае ахаладжэнне з-за перакульвання ў халодную ваду магло прывесці да спазмаў мышцаў. Нават у ратавальным жыльеце ў такім выпадку чалавек можа апынуцца ў рызыкоўнай сітуацыі. Таму на падобныя здарэнні звяртаем асаблівую ўвагу асоб, якія адказваюць за спартыўную падрыхтоўку юных спартсменаў.

Той факт, што дзеці не справіліся з кіраваннем спартыўнай лодкі, гаворыць аб іх недастатковых навыках веславання, таму за імі неабходны быў павышаны кантроль з боку трэнераў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Надвор'е

ЦЯПЛЕЙ СТАНЕ ТОЛЬКІ Ў ЧАЦВЕР

А ў нядзелю сіноптыкі абяцаюць ужо да 25 цяпла

Так бывае, калі лета вельмі моцна чакаеш, яно чамусьці абавязкова позніцца. Вось і першыя дні чэрвеня будуць халаднаватыя, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

А пакуль холадна — у ноч на першы дзень лета нас чакалі месцамі на глебе замаразкі да нуля — мінус 3 градусаў. Гэта не страшна, кажуць сіноптыкі: напрыклад, летась пачатак чэрвеня таксама выдаўся прахалодны, тады ў першы тыдзень лета максімальная тэмпература ўдзень не была большая за 10—18 цяпла.

Сёння ўдзень будзе пераважна без ападкаў. Вецер прагназуецца ўдзень паўночна-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра на працягу дня — не большая за 14—20 цяпла. У сераду на працягу сутак у нас чакаецца таксама досыць халоднае надвор'е. Але нягледзячы на тое, што летняга цяпла яшчэ прыйдзецца пачакаць, ёсць і добрыя навіны. Пры павышаным фоне атмасфернага ціску на працягу рабочага тыдня істотных ападкаў не чакаецца. Павышаецца верагоднасць кароткачасовых дажджоў толькі ў выхадныя. Вецер прагназуецца паўночна-ўсходні ўмераны, удзень па паўднёвым усходзе парывісты. Тэмпература паветра ў ноч на сераду складзе 4—10 градусаў вышэй за нуль, удзень — 17—22 цяпла.

Паводле слоў сіноптыкаў, з чацвярга надвор'е возьме курс на пацяпленне. Менавіта з гэтага дня тэмпературны фон пачне павышацца. А з чэрвеня будзе пераважна без ападкаў. Вецер прагназуецца паўночна-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы будзе ад плюс 6 да 11 градусаў цяпла, удзень — 18—23 градусы вышэй за нуль. Таксама сонечна і адносна цёпла чакаецца і ў пятніцу. Будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—12 цяпла, удзень — ад плюс 18 градусаў да плюс 24 градусаў вышэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу ўначы будзе пераважна без ападкаў, удзень у асобных раёнах магчымы невялікі кароткачасовы дождж. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 7 цяпла да плюс 14 градусаў, удзень будзе 19—24 градусы вышэй за нуль.

Значна пацяплее, асабліва ў цёмны час сутак, у нядзелю. У гэты дзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у дзённыя гадзіны ў асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 9 да плюс 14 градусаў, удзень — 20—25 цяпла. Вось гэта, мабыць, лета.

Сяргей КУРКАЧ.

ДЛЯ ЖЫЦЦЯ БЕЗ БАР'ЕРАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле яе даных, на выплату пенсій, дапамог, бясплатнага санаторна-курортнага лячэння для людзей з інваліднасцю дзяржава за мінулую пяцігоддзе накіравала больш за 13 мільярдаў рублёў. Інваліды 1-й і 2-й груп маюць права на 90-працэнтную, інваліды 3-й групы — на 50-працэнтную зніжку на прэпараты для лячэння захворванняў, якія прывялі да інваліднасці, і забеспячэнне сродкамі рэабілітацыі. Інваліды 1-й і 2-й груп бясплатна карыстаюцца грамадскім транспартам. Калі яны адзінокія ці пражываюць адны, забяспечваецца 50-працэнтная зніжка на тэхнічнае абслугоўванне і камунальныя паслугі. Інваліды, якія не працуюць, могуць скарыстацца першачарговым правам на бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне.

Як нагадала Вікторыя Грачыха, тры раздзелы з пяці ў дзяржаўнай праграме аб сацыяльнай абароне і занятасці насельніцтва накіраваны на павышэнне ўзроўню жыцця інвалідаў і пажылых грамадзян. Яны датычацца папярэджання інваліднасці і рэабілітацыі, безбар'ернага асяроддзя і сацыяльнай інтэграцыі інвалідаў і пажылых грамадзян. За пяць апошніх гадоў на іх рэалізацыю затрачана 2,3 мільярда рублёў. У тым ліку на кампенсацыю за самастойна набытыя сродкі рэабілітацыі, якія не выраблюцца ў краіне. На сёння ў гэтым пераліку 11 сродкаў рэабілітацыі (напрыклад, смартфоны для інвалідаў па зроку), і, магчыма, ён будзе пашыраны.

— На першым этапе ўстанаўліваліся пандусы, поручні, пашыраліся ўваходныя групы. Як правіла, гэтыя змены былі накіраваны на стварэнне безбар'ернага асяроддзя для людзей з парушэннямі апорна-рухальнага апарату. Без увагі заставаліся людзі з парушэннямі зроку, слыху. Сёння ж ліквідуюцца бар'еры для ўсіх катэгорый, — адзначыла спецыяліст. — Да 2025 года мы плануем зрабіць цалкам даступнымі больш за 22 % аб'ектаў — у абсалютных лічбах гэта больш за восем тысяч аб'ектаў.

Калі сёння 2-ю і 3-ю групы інваліднасці вызначаюць на адзін год, а першую — на два, то з уступленнем у дзеянне новага закона 2-я і 3-я групы будуць выдавацца на два гады, а першая — на тры.

У бягучай пяцігодцы на праграму сацыяльнай абароны ў цэлым плануецца накіраваць чатыры мільярды рублёў (без уліку пенсій, дапамог, расходаў на санаторна-курортнае лячэнне).

У каго больш шанцаў?

Як адзначыла Вікторыя Грачыха, амаль палова інвалідаў — людзі працаздольнага ўзросту. Але працаваць могуць толькі тыя з іх, хто мае адпаведнае медыцынскае заключэнне.

— На сёння заключэнні МРЭК маюць 118 тысяч інвалідаў — гэта крыху больш за палову тых, хто знаходзіцца ў працаздольным узросце. Працуе амаль 68 тысяч. Інваліды могуць уладкоўвацца як да наймальнікаў са звычайнымі ўмовамі працы, так і ў спецыялізаваныя арганізацыі. Безумоўна, больш шанцаў уладкавацца ў тых, хто мае прафесію і вопыт работы, — удакладняе спецыяліст.

У апошнія пяць гадоў навучанне праз службы занятасці прайшлі 1,5 тысячы беспрацоўных інвалідаў па 57 спецыяльнасцях. Самыя распаўсюджаныя з іх — аператар ПВМ, прадавец, кладаўшчык, ліфцёр. Накіроўваліся людзі і на навучанне прадпрымальніцкай дзейнасці.

— Штогод у цэнтры занятасці звяртаецца каля 4,5 тысячы чалавек. Пошук работы праз цэнтр занятасці мае пэўныя перавагі. Акрамя асноўных паслуг, якія яны атрымліваюць, для інвалідаў прадугледжаны і іншыя гарантыі: працаўладкаванне на забраніраваныя рабочыя месцы, адаптацыя да працоўнай дзейнасці, прыярытэтнае накіраванне на навучанне з аплатай расходаў на пражыванне і праезд. Прычым усе гэтыя паслугі бясплатныя, — праінфармавала Вікторыя Грачыха.

У мінулым годзе на пастаянную работу працаўладкавана амаль дзве тысячы людзей з інваліднасцю, сарака дзевяці аказалі садзейнічанне ў арганізацыі ўласнай справы. У службе занятасці арганізавана і новая форма работы — індывідуальнае суправаджэнне беспрацоўных інвалідаў для вырашэння пытанняў працаўладкавання. Калі чалавек звяртаецца ў службу занятасці, яго рэгіструюць у якасці беспрацоўнага і далей працуюць па індывідуальнай праграме. З яго згоды спецыялісты службы занятасці дамаўляюцца аб візіце на сумоўе да наймальнікаў і разам удзельнічаюць у перагаворах. Летась такая паслуга была аказана 268 інвалідам, працаўладкавана 259 чалавек. Плануецца выкарыстоўваць такую форму работы і надалей.

— Наша дзейнасць накіравана на адраснасць і індывідуальны падыход да кожнага. У будучыні для паляпшэння якасці жыцця інвалідаў будуць ствараца дадатковыя ўмовы з боку дзяржавы для працаўладкавання праз ukaranenne механізмаў кваліравання працоўных месцаў, удасканаленне адаптацыі інвалідаў да працоўнай дзейнасці, фінансаванне і кампенсацыю расходаў наймальніка на стварэнне рабочых месцаў для інвалідаў, — падкрэсліла Вікторыя Грачыха.

Маюць адбыцца змены і ў атрыманні адукацыі. У заканадаўстве плануецца замацаваць паняцце інклюзіўнай адукацыі, а таксама абавязковую даступнасць устаноў адукацыі для інвалідаў усіх катэгорый. Гэтыя і іншыя нормы замацаваны ў новым праекце закона «Аб правах інвалідаў і сацыяльнай інтэграцыі», які летась прайшоў першае чытанне ў парламенце.

Працаваць можна пры любой групе

Як паведаміў **дырэктар РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Васіль СМЫЧОК,** у Беларусі больш за 85 тысяч чалавек маюць інваліднасць першай групы, 252 тысячы — другой, 191 — трэцяй. Акрамя таго, больш за 34 тысячы дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў прызнаны інвалідамі.

— У нашай краіне нядрэнна рэалізоўваецца этапная сістэма медыцынскай рэабілітацыі. Згодна з адпаведным загадам Міністэрства аховы здароўя, пасля лячэння пацыента мусяць пераводзіць на этап рэабілітацыі. Гэта датычыцца такіх цяжкіх хвароб, як інсульт, інфаркт міякарда, анкалогія. Пацыенты з бальнічных устаноў выпісваюцца не дадому, а пераводзяцца ў стацыянарныя цэнтры медыцынскай рэабілітацыі, якія сёння функцыянуюць у кожнай вобласці. У нашай краіне 328 аддзяленняў медыцынскай рэабілітацыі, з іх 101 стацыянарнае з агульнай колькасцю 4680 месцаў (2773 — для дарослых і 1907 — для дзяцей), — паведаміў Васіль Смычок.

За 2020 год рэабілітацыю прайшлі 1235 тысяч чалавек, з іх больш за 111 тысяч інвалідаў, у тым ліку больш за 25 тысяч дзяцей.

Кіраўнік РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі адзначыў, што ў новым законе «Аб ахове здароўя», які пачне дзейнічаць з лістапада гэтага года, вызначаць інваліднасць будуць на новыя тэрміны. Калі сёння 2-ю і 3-ю групы інваліднасці вызначаюць на адзін год, а першую — на два, то з уступленнем у дзеянне новага закона 2-я і 3-я групы будуць выдавацца на два гады, а першая — на тры.

З'явіліся і новыя артыкулы, якія рэгламентуюць якасць аказання медыцынскай дапамогі:

— Не сакрэт, што ёсць шмат скаргаў, абгрунтаваных у тым ліку, калі якасць аказання медыцынскай дапамогі пакідае жадаць лепшага. Міністэрства аховы здароўя ўдзяляе шмат увагі гэтаму, на лячэбна-кансультатыўных саветах разбіраецца шмат выпадкаў аб якасці аказання дапамогі, так што разбор палётаў сур'ёзны, — заўважыў Васіль Смычок. — Створана рэспубліканская сістэма ацэнкі якасці медыцынскай дапамогі на трох узроўнях: раённым, абласным і рэспубліканскім. Гэта не азначае, што раней у нас не было кантролю якасці. Канешне, ён быў, але мы бачым, што ў многіх краінах існуюць цэлыя інстытуты па гэтым кірунку — у Канадзе, ЗША, Аўстраліі. І мы зараз выбудоўваем падобную сістэму.

Як падкрэсліў Васіль Смычок, паняцця непрацоўнай групы цяпер не існуе — чалавек і з першай групай можа працаваць, калі стан здароўя гэта дазваляе. Тут карыстаюцца дазвольным прынцыпам, а не забараняльным. Гэтак жа не існуе планавых паказчыкаў па абмежаванні колькасці інвалідаў — групу атрымлівае кожны, у каго ёсць на тое паказанні.

Як трапіць на рэабілітацыю?

Галоўны ўрач Рэспубліканскай дзіцячай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі Галіна РАДЗІВОНАВА расказала, што ўстанова займаецца з дзецьмі з анкалагічнымі, анкагематалагічнымі захворваннямі, паталогіямі нырак, нервовай сістэмы, а з 2016 года — і з рэдкімі генетычнымі хваробамі: мукаполісахарыдозам і з недаканалым остэагенезам, так званымі «крыштальнымі» дзецьмі.

— Яны паступаюць пасля лячэння, прычым па некалькі разоў, на працягу некалькіх гадоў, і мы іх адаптуем да жыцця ў тых умовах, у якіх яны апынуліся. Увага аддаецца не толькі фізічнай рэабілітацыі, але і псіхалагічнаму суправаджэнню. Ва ўстанове ёсць усё, каб аказаць дзецям прафесійную дапамогу.

Адна з самых вядомых устаноў па рэабілітацыі — Рэспубліканская клінічная бальніца медыцынскай рэабілітацыі, што знаходзіцца ў Аксакаўшчыне Мінскага раёна, — у наступным годзе, дарэчы, яна адзначыць 50-годдзе. Яе ложкавы фонд — 461 месца.

— Да нас паступаюць пацыенты кардыялагічнага профілю (пасля інфаркту, аортакаранарнага шунціравання і іншыя), неўралагічнага (пасля інсультаў і аперацый у РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі) і траўматалагічнага (пасля траўм і аперацый на апорна-рухальным апараце, эндапратэзаванне суставаў), — кажа **галоўны ўрач Рэспубліканскай клінічнай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі Сяргей МАЛЫШКА.** — Яны атрымліваюць увесь спектр паслуг — псіхакарэкцыю і фізічную рэабілітацыю. Гэта заняткі з інструктарамі лячэбнай фізкультурай, эргатэрапія, на рабатызаваных комплексах, медыкаментозная і дыетатэрапія, і, зразумела, метады фізіятэрапеўтычнага ўздзеяння. Больш за 95 % пацыентаў з'язджаюць ад нас з паляпшэннем стану здароўя.

Алена КРАВЕЦ.

Извещение о проведении 21 июня 2021 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «НПО Центр»

Предмет торгов
Производственный корпус № 1 общей площадью 3523 кв. м, инв. номер 611/С-2660; производственное здание общей площадью 3861,1 кв. м, инв. номер 611/С-9297; испытательная станция общей площадью 440,9 кв. м, инв. номер 611/С-10364; подстанция КТП общей площадью 40 кв. м, инв. номер 611/С-10368; хозпостройка общей площадью 376,9 кв. м, инв. номер 611/С-2659; открытый металлический навес с испытательными боксами общей площадью 549,1 кв. м, инв. номер 611/С-30483; сети хозяйственно-питьевого и противопожарного водопровода, инв. номер 611/С-31529; сети тепловые, инв. номер 611/С-31527; канализационные сети, инв. номер 611/С-31528; сооружение очистные V=250 м^3, инв. номер 611/С-31526; сети слаботочные внутриплощадочные, инв. номер 611/С-33332
Местонахождение: Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Марии Романович, д. 21
Сведения о земельном участке: кадастровый номер – 620450100001000588, площадь – 4,7852 га
Начальная цена: 1 617 760,00 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка: 161 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «НПО Центр», ул. Шаранговича, 19, ком. 304, 220018, г. Минск, (017) 259-03-57.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, тел. (017) 363-25-62.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «НПО Центр», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **21 июня 2021 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 02.06.2021 по 17.06.2021 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефону (017) 259-05-54 (ОАО «НПО Центр»).

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 259-05-54 (ОАО «НПО Центр»).

Извещение о проведении повторных электронных торгов

Организатор аукциона и оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46
Продавец	ООО «2К ЕвРо», г. Минск, ул. Калиновского, дом 55, пом. 2Н, комната 41С
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by
Предмет электронных торгов	
Диспетчерская (инв. № 442/С-8430, об. пл. 45,2 кв. м). Адрес: **Гродненская обл., Островецкий р-н, г. Островец, ул. Карла Маркса, 39.** Сведения о земельном участке: пл. **0,0186 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания диспетчерской	
Начальная цена лота с НДС 20 % – 15 500,00 бел. руб.	
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»	
Место проведения торгов: г. Минск, пр-т Победителей, 127, оф. 312.
Подробная информация о дате, времени и порядке проведения торгов, предлагаемых к продаже лотах, начальной цене и размере задатков, продавце и организаторе, иная информация, требуемая в соответствии с законодательством, размещены в Едином государственном реестре сведений о банкротстве: https://bankrot.gov.by/ManagerSection/ManagerPropertySale.aspx?AuctionID=15102 УНП 690019088

ЯК КІЯСКЁРЫ СТАНОВЯЦЦА... ПАЛІГЛОТАМІ

У гарадах і пасёлках краіны ўсё больш прасторных, утульных, «інтэлектуальных» павільёнаў «Белсаюздрук». У іх можна не толькі купіць газеты і часопісы, канцылярскія, іншыя тавары, але і выпіць кавы, атрымаць вялікі аб'ём сучасных паслуг. Навошта трэба ў чарговы раз даўжэй затрымацца ў пункце «Белсаюздрука»? Пра што, можа, і не ведаюць людзі, якія на «ты» з гаджэтамі? І як можна сэканоміць час і грошы, не заходзячы ў найбліжэйшую краму. Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў пра гэта з дырэктарам Віцебскага філіяла РУП «Белсаюздрук» Людмілай ГАЙДУК.

Людміла ГАЙДУК на цырымоніі адкрыцця смарт-павільёна каля Летняга амфітэатра ў Віцебску.

— Колькі ў Віцебшчыне гандлёвых аб'ектаў, якія належаць філіялу?

— Калі дакладна, 153. У тым ліку 137 кіёскаў, 14 павільёнаў (чатыры з іх — шматфункцыянальныя) і дзве крамы.

— Людміла Віктараўна, памятаю адкрыццё першага ў Падзвінні шматфункцыянальнага павільёна ў Оршы. Безумоўна, у жыхароў Аршаншчыны тады з'явілася чарговая нагода ганарыцца тым, што робіцца ў раёне. Па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы там працягваюцца пераўтварэнні.

— І РУП «Белсаюздрук», лічу, таксама ўносіць свой годны ўклад у працэс. У прыватнасці, з 2018 да 2020 года аб'ём фінансавання праграмы па развіцці Аршаншчыны перавыкананы на 4,2 % і склаў каля 400 тысяч рублёў. Пазалетась у цэнтры Оршы на вуліцы Леніна каля Дома гандлю адкрыўся аб'ект новага пакалення. У павільёне шматфункцыянальнага фармату наведвальнікам дадзена магчымасць купіць порцыю духмянай кавы, зарадзіць электронныя ўстройствы, ёсць доступ у інтэрнэт, а інтэрактыўны экран стане навігатарам па гарадскіх славутасцях.

Мае калегі могуць без праблем размаўляюць з замежнікамі на розных мовах свету... пры дапамозе анлайн-перакладчыка. Такі павільён не сорамна паказаць гасцям краіны. У яго прывабны дызайн, выкананы сапраўды сумленна, вельмі якасна, з добрых матэрыялаў. Унутры цёплыя падлогі, кандыцыянер. У мэтах бяспекі вядзецца відэаназіранне. Усё гэта дазваляе стварацца камфортныя ўмовы як для пакупнікоў, так і для прадаўцоў. Дарэчы, узровень абслугоўвання ў такіх павільёнах ацэньваецца «лайкерамі» — спецыяльнай сістэмай, створанай для зручнасці кліентаў.

Ужо ёсць цікавая статыстыка наконт эфектыўнасці функцыянавання смарт-павільёнаў. Продаж тавараў там павялічваецца прыкладна ў два разы, а газет і часопісаў — на 70—80 %.

— А дзе яшчэ можна ўбачыць новыя павільёны?

— Летась мы напярэдадні міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» замянілі гандлёвы павільён на «інтэлектуальны» шматфункцыянальны ў раёне галоўнай сцэнічнай пляцоўкі «базару» — Летняга амфітэатра. У Оршы на вуліцы Камсамольская цяпер ёсць наш фірменны пункт, які адпавядае патрабаванням часу. У мінулым годзе адкрылі два гандлёвыя аб'екты ў Віцебску: на вуліцы Маргелава (у новым спальным мікрараёне Білева) і на Маскоўскім праспекце, замест старога ўстанавілі новы павільён на Прывакзальнай плошчы абласнога цэнтра. Сёлета зноў жа ў Оршы запланавана «ракіроўка» на вуліцы Дзяржынскага, на аўтобусным прыпынку «Вакзал».

— Калі, бывае, разглядваю вітрыны кіёскаў, вочы разбягаюцца ад вялікай колькасці газет, часопісаў, рознага тавару. Можаце агучыць лічбы, колькі ўсяго прыкладна?

— Праз гандлёвую сетку філіяла рэалізуецца каля 640 найменняў перыядычных выданняў розных тэматык. І сярод іх доля беларускіх — большая за 70 %. Для павелічэння продажу падтрымліваецца цесны кантакт з выдавецтвамі і рэдакцыямі. Праводзяцца конкурсы сярод работнікаў на найлепшага распаўсюджвальніка друкаванага СМІ.

Вельмі спадабаліся кліентам нашы «кававыя акцыі»: пакуль чакаеш свой кубак, атрымліваеш у падарунак газету. Усё больш папулярная падпіска да запатрабавання на друкаваныя выданні ў кіёсках. Наконт тавараў: рэалізоўваем больш за тысячу найменняў. У асартыменце школьна-пісьмовыя прылады, парфумерна-касметычныя тавары, цацкі, латарэйныя і праязныя білеты і гэтак далей.

— Дарэчы, заўважыў, што цукар у кіёсках вашага філіяла таннейшы, чым у краме вядомага гандлёвага брэнда, які асацыюецца з самымі прывабнымі цэнамі.

— Стараемся і такім чынам прывабліваць пакупнікоў. Мы і тушонку прадаём, іншыя прадукты харчавання. У многіх нашых гандляроў ужо ёсць пастаянныя пакупнікі, якім падабаецца, не заходзячы ў краму, на вуліцы купляць той жа цукар, шакаладкі, печыва і гэтак далей па параўнальна нізкіх цэнах. Няхай і невялікая, але эканомія грошай будзе. І да нас зручна прыходзіць па пакупкі, тым больш што маем нямала аб'ектаў, якія працуюць да позняга вечара і нават круглыя суткі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота Алега КЛІМОВІЧА.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ЗВЯЗДА» — РУПЛІВЫМ ГАСПАДАРАМ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Звязда» — руплівым гаспадарам» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі. Тэрмін — з 1 чэрвеня 2021 года да 30 верасня 2021 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2021 года.

2. Арганізатар Гульні — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месцазнаходжанне: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — Рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», — і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ, руб. кап.	Усяго з ПДВ, руб. кап.
1	Бензакаса Spec-2501, (далей — суперпрыз)	1	225,00	225,00
2	Набор садовага інструменту Palisad 63020, (далей — прыз)	7	48,384	338,69

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам» складае: — 563,69 (пяцьсот шэсцьдзясят тры рублі 69 капеек).

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Звязда» — руплівым гаспадарам» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2021 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які афарміў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2021 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 1 чэрвеня да 13 ліпеня 2021 года выразаная з газеты або з дадаткова-га ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 1 чэрвеня да 13 ліпеня 2021 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 15 ліпеня 2021 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ілынічна — намеснік дырэктара Рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Дашкевіч Юлія Андрэеўна — намеснік дырэктара Рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» Рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара Рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 16 ліпеня 2021 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 24 ліпеня 2021 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 24 ліпеня 2021 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2021 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2021 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2021 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 30 верасня 2021 года ў памяшканні Установы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефонах (017) 263-66-73, 287-17-40 для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, Установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаюцца.

20. Пасля 30 верасня 2021 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковаў справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаныя з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны разам з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах: (017) 263-66-73, 287-17-40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3996 ад 25.05.2021 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Асобы

УСПАМІНАЮЧЫ ВОЛАТА З МІГАЎКІ

У Маладзечне прайшла канферэнцыя, прысвечаная выдаўцу Аляксандру Уласаву

Мала пра каго ўзнікала столькі неверагодных гісторый, як пра гэтага чалавека. Аляксандр Уласаў, бацька беларускага Адраджэння. З пароды волатаў, неардынарных, багатых натур, якія нараджалі легенды.

Менавіта гэтаму чалавеку-міфу была прысвечана навукова-краязнаўчая канферэнцыя «Сейбіт праўды і веры», якая прайшла ў Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М. Багдановіча.

Слынны краязнавец, бібліяфіл, супрацоўнік бібліятэкі Міхась Казлоўскі, дзякуючы якому ўжо не першы раз у Маладзечне праходзяць падобныя канферэнцыі, расказаў, што гэтая — чатырнаццатая па ліку. Пра Аляксандра Уласава мусілі гаварыць у мінулы год, але тады не змаглі правесці канферэнцыю з-за пандэміі. Сёлета ўсё ж сустрэліся, і нагода ёсць — восемдзесят гадоў з дня смерці.

«Уся яго постаць нагадвала дзябёльную чыгунную тумбу...»

Калі знаёмішся з успамінамі, верыш, што Уласаў, даведаўшыся пра арышт часовага рэдактара «Нашай Нівы» Янкі Купалы, пабег да Лукішак і лупіў нагой у дзверы злавеснага пастарунка, патрабуючы, каб пасадзілі яго, колішняга рэдактара, а не паэта.

Волат-памешчык, які «апрашчаўся» так, што выклікаў здзіўленне і пострах у мужыкоў. Дзівак, якога можна было заспець у садзе на дрэве амаль што голым — згодна са згадкамі пляменніцы Веры Тарашкевіч. «Раз прыйшла нейкая дзяўчына, і яе паслалі ў сад. Яна пайшла, клічучы: «Пане сэнатар!», і раптам пачула недзе з гары: «Гоп, гоп!» Падняла галаву, а там на дрэве нейкае вялізнае, амаль голае цела. Гэта дзядзька пілаваў сукі на дрэве... Дзеўка ледзь не самлела».

Як успамінаў Якуб Колас, «Уся яго постаць нагадвала дзябёльную чыгунную тумбу. У яго пакоі былі гіры і штангі, і ён прыступаў да гімнастычных практыкаванняў...»

«Яна была Марыя Мнішак, а я Дзьмітры Самазванец»

Бясстрашны грамадскі дзеяч і палітык, які прысвяціў сябе беларускай нацыянальнай ідэі. І адначасова рамантык і заляцаннік у духу куртуазнай шляхты. Згадаю ўрывак з яго ўспамінаў пра амурныя справы маладосці:

«Уся работа мая перапляталася з каханьнем. Носячыся па краю вялясыпэдам, я спаткаў чорнавалосую, чарнавокую палескую «прынцэсу»... Зразу нас прыцягнула, як два магніты. ...Яна была Марыя Мнішак, а я Дзьмітры Самазванец, які ня квапіўся ні на якую карону. Бліскучы малы, але ў жыцьці нейкі рэдактар «Сахі» і «Лучынкі», а тут польская газэта ў Вільні ахнула заборыстую стацыю процію мяне і бунтаўшчыкоў-беларусаў. Бабулі, мамы расчыталі... і я дастаў палітычны гарбуз... Праз колькі часу ў мяне закахалася ізноў брунэтка (мне вязець шчасьце на брунэтак, бо мая мілая жонка таксама яшчэ брунэтка). Дамок у вішнёвым садзе, салавей, фантаны нявінных пацалункаў, вулканы каханьня... Но... Каталічка, ксёндз, разумныя бацькі, чым ён займаецца і г. д. Ізноў гарбуз паміж намі. ...Калі-небудзь раскажу пра свой раман з ангельскай багіняй Дыянай, але гэта мала ўходзіла ў беларускую сфэру, вярней сказаць, каханьне гэта магло б мяне вынесьці з гэтай сфэры. Усе мае ахвяры богу каханьня — Амуру былі ўсім вядомы, бо я ўсім стрэчным-папярэчным жывапісаў пра сваіх багінь».

Ці не праўда, нагадвае гэткага старасвецкага шляхцюка шырокае душы з велягурыстай манерай размовы, які п'е з туфліка чароўнай дамы, а можа тут жа ўзнацца на двубой за скосы позірк, ці ўступіць у высакароднае спаборніцтва, хто болей сваёй маетнасці парушыць, бо не варта шляхціцу даражыцца зямнымі рэчамі. Казачны герой, які адчыняў у знаёмых фортку так, што вынес яе разам з рамай, а дапамагаючы рабочым пераносіць на лета прыбіральню, якую яны не маглі зрушыць, незаўважна прыхапіў аднаго з рабочых, які на той прыбіральні павіс, не паспеў саскочыць.

Дарэчы, тое, што ажаніўся Аляксандр Уласаў у 51 год, таксама надае манументальнасці яго абліччу — нібыта непадуладны беларускі волат быў гадам... Толькі часы сталінскіх рэпрэсій змянілі і яго: на шляху ў Сібір, па ўспамінах, быў ён схуднелы, з запалымі шчокамі...

Вельмі пасуе да вобраза «волата з Мігаўкі» і назва «Дзікая зала» — так называлася памяшканне ў Мігаўцы, дзе ладзілі беларускія «шпектаклі» ды розныя вечарыны. Кажуць так называлі пакой, бо было там халодна ды прасторна. А як прыходзілі паліцыянты, гаспадар казаў: «Няма грошай на штрафы. Іду ў турму... Не прывыкаць... Не адзін раз сядзеў... Пасяджу і яшчэ...»

Такога персанажа можна ўявіць галоўным героем гістарычнага рамана пра мінулыя стагоддзі, з мячом, шабляю альбо шастапёрам у руцэ, на чале харугвы.

«Паўлінка» ў Радашковічах

Аляксандр Уласаў, пакуль быў рэдактарам-выдаўцом «Нашай Нівы», «пашыраў кола рупліўцаў на ніве беларушчыны». Сярод тых рупліўцаў быў Антон Грыневіч, якому 11 чэрвеня 1911 года Уласаў даў ліст, у якім прасіў садзейнічаць, аказваць дапамогу ў збіранні народных песень. Менавіта пра збіральніка беларускага фальклору, педагога і кампазітара Антона Грыневіча расказала падчас канферэнцыі Яніна Грыневіч, навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры.

Дарэчы, гэта Аляксандр Уласаў зладзіў прадстаўленне Купалавай «Паўлінкі» ў Радашковічах. Пра гэта нагадаў вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Павел Каралёў. Расказаў і пра тыя артэфакты, датычныя Уласава, якія захоўваюцца ў музеі. Напрыклад, пашпарт Уласава 1925 года дае такія звесткі:

«Узрост: сярэдні;
Вочы: карыя;
Нос: умеркаваны;
Валасы: цёмныя;
Твар: авальны;
Месца нараджэння: Вілейка;
Веравызнанне: праваслаўны;
Валоданне мовамі: польская, беларуская, нямецкая, англійская...
Прафесія: сенатар».

Захоўваецца і дакумент пасляваеннага часу, складзены ўдавой Купалы, Уладзіславай Францаўнай Луцэвіч, для прадстаўлення ў Камітэт дзяржаўнай бяспекі БССР, дзе вельмі добра характарызуе Уласава, які загінуў у лагерах, каб папрасіць яго рэабілітацыі. «Александр Никитич Власов отличался простотой, остроумием, гуманностью».

Менавіта Уласаў сустрэў у Мінску на адным з настаўніцкіх з'ездаў Кастуся Міцкевіча, у будучым Якуба Коласа, якога далучыў да супрацоўніцтва з газетай. Пра гэта, а таксама, як Уласаў стаў рэдактарам «Нашай Нівы», згадваў кандыдат гістарычных навук Андрэй Унучак. А пісьменнік і краязнавец Сяргей Чыгрын прысвяціў свой даклад сябру Аляксандра Уласава, шведскаму місіянеру Джону Віту, які зрабіўся фундатарам беларускіх гімназій.

«А мянушка была — Какос, бо вялікая галава, і надта шмат чытаў»

Уразіў гасцей і ўдзельнікаў канферэнцыі расповед праюрадраднай пляменніцы Аляксандра Уласава, Ірыны Вацлававўны Ніжанкоўскай.

— Мама мая — пляменніца Аляксандра Уласава. Уласаў паходзіў з сям'і рускіх чыноўнікаў. Яго дзед прыехаў сюды ў пачатку XIX стагоддзя, бацька, Мікіта Уласаў, быў паштмейстрам у Вілейцы. Вельмі вялікая сям'я, але з дзяўчынак засталася адна мая бабка. А было яшчэ пяць хлопцаў. Памятаю з расповедаў, што ва ўсіх хлопцаў былі мянушкі. Аляксандра Уласава ўсе дома звалі Саша, а мянушка была — Какос. Бо вялікая галава была, і надта шмат чытаў. Саша з дзяцінства да дзірак кнігі зачытваў. А вучыцца не надта хацеў. Вось садзяць яго вучыцца... Падыходзяць да дзвярэй пакоя, слухаюць: «Дэр фатэр — ацец... Дэр фатэр — ацец...» Саша нямецкай займаецца! Праз паўгадзіны зноў падыходзяць, зноў чуюць: «Дэр фатэр — ацец, дэр фатэр — ацец...». Адчыняюць — ён чытае нейкую кніжку, услых паўтарае «Дэр фатэр — ацец», а яшчэ вяровачкай з паперкай з кацянём гуляе... Мама ўспамінала, як дзядзька ладзіў спартыўныя спаборніцтвы, калі жыў у Мігаўцы. Было спаборніцтва: жэрдкі клалі, і трэба было па тых незамацаваных жэрдках бегаць. Адзін малады чалавек надта зграбна там бегаў, дасціпны, вясёлы. Так мама пазнаёмілася з Браніславам Тарашкевічам, сваім будучым мужам. У часы Польшчы Уласаў займаўся Таварыствам беларускай школы, курсы беларускіх настаўнікаў у Мігаўцы праходзілі. Каб адкрываць беларускія суполкі і школы, патрэбны быў дазвол паліцыі. Туды дакументы падаць з адрасам, дзе што адбудзецца. Вось Уласаў павінен быў ехаць у нейкі горад, праводзіць сход. А адраса, дзе той сход адбудзецца, няма... Ён кажа: напішыце, гасцініца «Еўропа». Напісалі... У паліцыі высвятляецца, што там няма такой гасцініцы. Ну і сарваўся той сход па арганізацыі школы. Уласаў абураўся: «Што гэта за горад такі, каб не было гасцініцы «Еўропа»? На сваю хату ў Мігаўцы ён казаў — «Мая віла». Жонка яго ўспамінала, як прывёз ён яе ўпершыню на тую «вілу» — а яна бачыць, пад старой страхой вясковая хата. Была ў шоку ад такой «вілы». Паесці любіў. Мамі на сям'я жыла ў Радашковічах, і кухарка расказвала, вось прыходзіць Аляксандр Уласаў. З'еў адну місу варэнікаў, другую, трэцюю... А пасля і кажа: «Але ж і нясмачныя ў вас сёння варэнікі». Вялікі быў, боты не мог купіць. Купляў меншыя і ў рэчку заходзіў, каб яны размяклі. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі прыехаў на кані з Радашковіч і кажа: «Вось цяпер я папрацую на карысць Беларусі». Паехаў у Маладзечна, у рэдакцыю... І не вярнуўся.

Уласаў памёр у Сіблагу. Міхась Казлоўскі мяркуе — мала пратрымаўся, хоць і волат, бо на ягоную вагу звычайная порцыя баланды была замалая. І слушна заўважыў, што варта сабраць усе існуючыя ўспаміны пра Уласава ў асобнае выданне. Для панарамы беларускага адраджэння канца XIX — пачатку XX стст. постаць Аляксандра Уласава важная яшчэ і самім сваім іміджам. Беларускіх адраджэнцаў уяўляюць плоска: альбо ўчарашні сялянскі сын, «пан сахі і касы», альбо слабагруды інтэлігент, які аплаквае народную долю і рамантызуе курганы ды сівыя туманы. Для стварэння прымальнага нацыянальнага міфа надзвычай важна, улічваючы і «аплакваючую», і «рамантызуючую» тэндэнцыі ў яго стварэнні, выбіраць найбольш яркае, запамінальнае, здольнае выклікаць цікавасць і гонар. Мне вельмі імпануе, калі развейваюць міф пра Купалу-селяніна, паказваючы яго фацэтам у модных касцюмах, са шляхецкімі каранямі. Ці калі пра Багдановіча, якога ўяўляюць хваравітым ды субтыльным, усплывае факт, як у Ніжагародскай гімназіі ён быў задзірыстым нанканфармістам. Аляксандр Уласаў усёй сваёй каларытнай постаццю можа прыкрасіць беларускі нацыянальны міф — засталося толькі дабіцца, каб ягоная постаць стала пазнавальнай.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

З кніжных развалаў

ЦЕПЛЫНЯ ПАЭТЫЧНЫХ АЎТОГРАФАЎ

Люблю знаёміцца са старымі прыватнымі кнігазборамі. Асабліва — настаўнікаў. Уражанне складваецца такое, што ў 1950—1970-я гады яны набывалі ўсё, што выходзіла з беларускай прозы і паэзіі. Так, асветніцкай, гістарычнай літаратуры тады проста катастрафічна не хапала. А вось мастацкай, як і цяпер, выдавалася нямала...

І ў гэтых кнігазборах нярэдка сустракаюцца кнігі з аўтографамі. Пісьменнікі прыязджалі ў школы, ліставаліся з настаўнікамі. Часта і педагогі разам з вучнямі прыязджалі на сустрэчы. У Дом літаратара, напрыклад. А некаторыя аўтографы заставаліся з часін вучобы на філалагічным ці іншым факультэце ўніверсітэта альбо педагагічнага інстытута.

Вось і ў мінскай кватэры выпускніка філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Івана Адамавіча Зяньковіча я знайшоў шмат кніг з аўтографамі беларускіх пісьменнікаў.

Не буду расказваць пра ўвесь кнігазбор, а працытую два барадулінскія аўтографы. Адзін з іх — на кнізе «Маладзік над стэпам». Гэта — перавыданне знакамітага барадулінскага зборніка «Маладзік над стэпам». Перавыданне 2010 года. Вось выхадныя даныя: Барадулін Р. Маладзік над стэпам. Вершы. Мн., 2010. Наклад 300 асобнікаў. Цытуем аўтограф: «Івану Адамавічу Зяньковічу — з пашанай! Рыгор Барадулін 27.XII.10».

Другі зборнік — Барадулін Р. Адам і Ева. Мн., 1968. Аўтограф наступны: «Дарагому Івану Зяньковічу, жадаючы вялікіх посьпехаў! Чакаю ў адказ у хуткім часе аўтографы на тваім зборніку. Рыгор. 25.XI.71 г.». Ёсць яшчэ дадатак: «І праз трыццаць гадоў, Іване, хай Вам лепей стане, І праз сорак, як у дваццаць,<...> ! Дзядзька Рыгор. 2.04.02».

Другі аўтограф — і сведчанне новай сустрэчы Івана Адамавіча Зяньковіча з паэтам праз многія гады пасля студэнцтва. І, зразумела, сведчанне яго пастаяннай увагі да беларускай літаратуры, пісьменніцкага асяроддзя, да роднага беларускага слова.

Зберагаючы старую беларускую кнігу, зберагаючы кнігі з аўтографамі, мы захоўваем і матэрыяльны складнік нашай айчыннай гісторыі, і само святло любові да беларускага прыгожага пісьменства. Іван Адамавіч Зяньковіч, які, дарэчы, вучыўся на адным курсе з доктарам філалагічных навук Іванам Штэйнерам, разам са славутым беларускім літаратурным краязнаўцам Уладзімірам Лайковым, сябравалі доўгія гады з паэтам і літаратуразнаўцам Алегам Антонавічам Лойкам. Ёсць у кніжным зборы былога студэнта-філолага і іншыя аўтографы, ужо сама цеплыня іх, арыгінальнасць шмат здольны расказаць і перадаць праз час.

Напісаўшы гэтую невялічкую нататку, задумаўся: добра было б узнавіць памяць пра многія дарчыя надпісы. Каб не згубіліся ў часе, а змаглі нагадаць пра любоў да кнігі тых, кім яна напісана, кім ствараліся і кім захоўвалася і захоўваецца.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Храмы маёй радзімы

ПЯЦЬ ЗВАНОЎ ВЯЛІКАЙ ЛІПЫ

Свята-Пакроўская царква,
в. Вялікая Ліпа, Нясвіжскі раён

«Свята-Пакроўская царква ў в. Вялікая Ліпа. На ўскраіне вёскі, на старажытных могілках. Пабудавана ў сярэдзіне XVIII ст. як уніяцкая царква (у інтэр'еры захаваўся мураваны алтар). Закрыта ў 1963 г., з 1990 г. дзейнічае. Акрамя царквы на могілках знаходзяцца дзве старажытныя надмагільныя капліцы, каля галоўнага фасада царквы — мураваная званіца...»

З кнігі «Памяць. Нясвіжскі раён».

У кожнага з нас свая дарога да храма. У мяне таксама. Вядома ж, запачаткавалася яна ад маіх бацькоў — Івана Бутэвіча і Марыі з Мазаноў. Пачалося ўсё з хутара Язавец, што на Нясвіжчыне, адкуль я зусім малечай за ручку з мамай упершыню наведаў тадышнюю Вяліка-Ліпаўскую Свята-Пакроўскую царкву, што кіламетраў за пяць ад нашай хаты. Не ведаю, што мяне так прывабіла, але пасля гэтага я часта напрошваўся ў спадарожнікі то да маіх бацькоў, то да дзядулі Яся з бабуляй Гандзяй, калі яны выпраўляліся на чарговы малебен.

З першай паловы XVII стагоддзя Вялікая Ліпа амаль 400 гадоў знаходзілася ў валоданні роду Абуховічаў. Гэта старадаўні шляхецкі род герба «Ключ раздвоены». Сёе-тое з іхняга валодання засталося дагэтуль, хоць і не ў вельмі добрым стане. Добра вядомы ўладальнік Ліпаўскага маёнтка, мазырскі шляхціц, дзяржаўны і ваенны дзеяч, дыпламат Піліп Казімір Абуховіч, які памёр у 1656 годзе і пакінуў нашчадкам свае дзённікі з гісторыі Рэчы Паспалітай напярэдадні «Патопу». Дарэчы, мая Вяліка-Ліпаўская васьмігодка размяшчалася ў былым палацы Абуховічаў, што непадалёк ад царквы. Праўда, ад яго застаўся толькі адзін двухпавярховы будынак, але ж які! Падлога — паркетная, каміны ледзь не ў кожным пакоі, вокны выкшталцоныя і вялікія, каменная лесвіца на другі паверх... А пазней побач збудавалі і яшчэ адзін корпус — перанеслі сюды царкоўна-прыходскую школу.

І што яшчэ запомнілася з тых даўніх дзіцячых гадоў, дык гэта справядлівасць слоў многіх жанчын, якія прызнаваліся, што ў далёкую дарогу выпраўляліся з босымі нагамі, неслі туфлі ў руках (каб не так хутка знасіліся?) і абуваліся, толькі памыўшы ногі. Так рабілі і мая маці з бабуляй толькі я, а і жыхары Баяраў, куды мы ў 1956 годзе перасяліліся з хутара, як і многія-многія насельнікі навакольных вёсак, з вялікай прыхільнасцю ўспрынялі прыезд Уладыкі Філарэта ў жніўні 1993 года на богаслужэнне ў нашай больш як 200-гадовай царкве, што нанава адраджалася пасля «прыснопамятного богаборчества».

Гэта быў першы, але не апошні, прыезд па маёй тады міністэрскай просьбе высокага іерарха ў Вяліка-Ліпаўскую царкву. У тым жа годзе і ў той жа дзень адбылася яшчэ адна незвычайная для вясковага

жыцця наогул, а для мяне і маіх землякоў проста чарадзейная падзея. Да скону згадвалі мае бацькі той памятны момант, калі Уладыка Філарэт пасля службы ў храме разам з народным артыстам СССР Віктарам Роўдам пераступілі парог бацькоўскай хаты ў вёсцы Баяры, каб павіншаваць маю маму Марыю з 70-гадовым юбілеем.

А 21 кастрычніка 2004 года Уладыка Філарэт прыехаў у Ліпу, каб урачыста адзначыць памятную не толькі для гэтай мясцовасці дату. Устаноўленая тады дошка паведамляе, што ў гэтай царкве 100 гадоў таму, 23 верасня 1904 года, быў

ахрышчаны народжаны ў недалёкай вёсцы Завітая Антон Вікенцевіч Мартас, які пазней стаў архіепіскапам Аргенціны Афанасіем.

У пачатку новага XXI стагоддзя Уладыка блаславіў мяне на старанні ў справе аднаўлення зніклых у нядобры час царкоўных званоў. З дапамогай вернікаў, з падтрымкі мясцовай сельсавецкай улады, са спрыяння добрых людзей у Мінску я выканаў свой абавязак перад землякамі — неўзабаве пяць званоў былі адлітыя ў беларускай сталіцы, а Уладыка Філарэт 21 кастрычніка 2006 года зноў наведаў Вяліка-Ліпаўскую царкву, каб асвяціць іх. І сёння над палеткамі, над ваколіцамі вёсак Вялікая Ліпа, Высокая Ліпа, Баяры кожную нядзельку, кожнае царкоўнае свята чуецца з пануючага пагорка супакаяльны і поклічны звон, які сведчыць і пра дабрадзейныя справы Уладыкі Філарэта. Я ж на ўсё жыццё запомніў поціск рукі Мітрапаліта і яго добрыя словы, калі ён уручаў мне спачатку Грамату Патрыяршага Экзарха, а пазней ордэн Свяціцеля Кірылы Тураўскага.

ГІСТОРЫЯ Вяліка-Ліпаўскай царквы — гэта гісторыя і тамтэйшай зямлі, тамтэйшых людзей.

Памятаю, як у 1963 годзе, калі нечакана закрылі царкву, прыхаджане не маглі змірыцца з такой несправядлівасцю. Але што яны маглі зрабіць? Адно хіба — разлічваць на спагаду высокага начальства. Самыя актыўныя пачалі збор подпісаў. Завіталі і ў нашу хату. Але дома акрамя мяне, дзевяцікласніка, нікога не было, бацькі — на калгаснай рабоце. Ды хіба мог я схавацца за іх спіны? Смела прапанаваў: давайце, падпішу. Не, не за самога сябе — за бацьку. Я добра ведаў яго пазначаны малапісьменнасцю подпіс, часам даводзілася рабіць гэта за яго. Так зрабіў і тым разам. Але бацьку не сказаў нічога — ці мала што.

Праз нейкі час бацька расказаў дома, што яго раптоўна «адспавядаў» старшыня калгаса Уладзімір Галушка, з якім у 1944 годзе яны абодва, пасля вызвалення ад фашыстаў нашых зямель, былі мабілізаваныя на шахты ў Данбас, а бацька нават быў начальнікам над высокаліпаўскім мужыком. Выгаварыў за тое, што бацька, пастаянны дэпутат сельсавета, адважыўся падпісаць прашэнне не закрываць царкву. Перад старшынёй бацька прамаўчаў, а дома спытаўся ў сямейнікаў: і хто гэта без яго ведама паставіў подпіс? Усе маўчалі. Паўтарыў пытанне некалькі разоў, шторaз больш сурова. І тады я мусіў прызнацца, маральна падрыхтаваўся да вымовы, а мо нават і папругі. Але... Бацька толькі спытаў, а чаму ж нічога не сказаў яму. Паразумеліся. Бацька быў на маім баку. Царкву тады, праўда, так і не адкрылі.

А здзекі з вернікаў прадоўжыліся і такім незвычайным чынам. Неўзабаве да калгаснага цялятніка, дзе тады даглядчыкам працаваў бацька, пачалі звозіць шматлікія добра апрацаваныя драўляныя пацурбалкі — для спальвання ў печы, дзе рыхтавалі цялятам пойла. Аказалася, гэта нядаўнія прыдарожныя крыжы, якія, убраныя, стаялі каля ўязду ў кожную вёску. Ды раптам усе іх зрэзалі — закрылі царкву, то непатрэбныя і крыжы. Спальваць іх, вядома, бацька адмовіўся. Але стаць нанава каля вёсак ім давялося няскора.

ПАМЯТАЮ і сваю першую ўсяночную. Вядома ж, у дзяцінстве. Што праўда, хадзіў да царквы перадвелікодным вечарам і раней, але на ўсю ноч не заставаўся. І вось бацька згадзіўся. Разам з ім каля поўначы прыйшлі да храма. А тут ужо займаліся сваімі вясёлымі справамі многія больш і менш за мяне дарослыя хлопцы — бегалі, забаўляліся, а пасля палілі факелы, з якімі насіліся па прыцаркоўнай тэрыторыі. З пачаткам службы бацька забраў мяне ў царкву. Але выстаяць да раніцы я не змог. Калі сон пачаў настойліва закрываць мае вочы, я залез на хоры, бо харысты спявалі ўнізе, і прытаіўся. Бацька ж адмаліўся ўсю службу, пасвянціў яйкі і сабраўся дамоў. Не знайшоўшы мяне, падумаў, што я цішком збег дахаты. Калі ж спытаў маці, дзе Толік, тая здзіўлена адказала: «З табой жа быў». «Са мной-то са мной, але ж у царкве яго не было, калі адыходзіў». Давялося ісці назад, шукаць. Я ж на хорах не толькі адпачыў, але і моцна заснуў. Толькі царкоўны служка, калі трэба было замкнуць царкву, падняўся на хоры і ледзь разбудзіў. Па дарозе дамоў бацька і сустрэў мяне.

З дзяцінства памятаю і яшчэ адну царкоўную адметнасць. Электрычнасці тады не было не толькі ў царкве, а і ў нашых Баярах. Але святла хапала ў храме заўсёды, нават падчас начной службы. Мяне ж здзіўляла вялікае панікадзіла са свечкамі, якое вісела высока ад падлогі. І як туды можна ўставіць свечкі, а тым больш запаліць, калі нават выцягнутай рукой не дастанеш? І вось аднойчы я гэтае дзіва ўбачыў. Аказваецца, была доўгая гладкая палка (дагэтуль не ведаю, як называецца), на адным канцы расшчэпленая. Дык вось, каб паставіць у панікадзіла свечку, яе ўстаўлялі ў гэтую расколіну, падымалі ўгару і апускалі ў падсвечнік. Калі ж трэба было асвятляць, устаўленую ў палку свечку запальвалі і ёю запальвалі ўсе іншыя. Няпроста, але выгадна. А каб патушыць свечкі, карысталіся іншай палкай — з жалезнай загнутай убок трубкай на канцы. Праўда, малым і недарослым гэтай адказнай справы не давяралі.

І была яшчэ адна прывабная адметнасць нашай царквы. Гэта штогадовае ўрачыстае святкаванне Успення Прасвятой Багародзіцы 28 жніўня. Так склалася, што гэтае свята з'яўлялася самым галоўным не толькі для царквы, а і для найбліжэйшых вёсак. Адзначалі яго і вялікім урачыстым богаслужэннем, і многімі свецкімі мерапрыемствамі. Падобнае свята з такімі ж атрыбутамі, але ўжо Пятра і Паўла, адбывалася 12 ліпеня ў царкве Казьмы і Дзям'яна ў Снове, куды хадзілі і мы. А 28 жніўня ў адказ святкавала Вяліка-Ліпаўская Свята-Пакроўская царква. Зранку да яе з'язджалася мноства вазоў, вазкоў, павозак, якія спыняліся перад парканам. Коней выпрагалі, падкладвалі сена, аглоблі задзіралі ўгару, каб не замінялі, а на вазах папраўлялі дзяружкі, пасцілкі, дываны, якімі засцілалі салому, што служыла сядзеннямі. Рабілі знарок, каб было відаць, як пастараліся гаспадыні, на ўласных кроснах выткаўшы гэтыя шыкоўныя вырабы. Каля царквы збіраліся не толькі навакольныя жыхары, нават з вельмі далёкіх і не нясвіжскіх вёсак прыязджалі сваякі. Сёй-той з пэўным гонарам прыбываў на роварах, як называлі ў нас веласіпеды. Ды ўсё ж такі большасць блізкіх прыходзіла пешкі.

А на тых вазах чаго толькі не было — найбольш прадуктаў з уласных агародаў, хапала і выпечкі, і самаробных цукерак, і свістулек, і ўсяго іншага, назваў чаму я не запамінаў ні тады, ні пазней. Шчырыя размовы, гамонкі, згадкі, успаміны, крыўды, што даўно не бачыліся... Але найперш была служба ў царкве, куды і ўвайсці было цяжка ад мноства вернікаў.

Мне, школьніку, запомнілася і яшчэ адна дэталь. Як правіла, стаяла гарачыня. Спёка выклікала смагу, хацелася піць. А дзе ты возьмеш той вады? На вазах яе не было. І вось нехта кемлівы знайшоў выйсце: набраў вады ў найбліжэйшым калодзежы і насіў вядро і жалезны кубак між вазамі. А за ім ледзь не чарга, нягледзячы нават на тры капейкі, якія гаспадар вядра браў за адзін кубак (праўда, некаторыя давалі толькі адну капейку). Вяртацца яму да калодзежа даводзілася не адзін раз.

Да гэтага свята загадзя прыбіраліся і ў вакольных хатах, пяклі пірагі, іншыя прысмакі, гналі самагонку, каб частаваць гасцей, якіх часта было больш, чым месца ў хаце. Таму некаторыя накрывалі сталы святочнымі абрусамі (каб бачылі) на падворку. Пасля царкоўнай службы ўсе разыходзіліся па вёсках разам з гасцінnымі гаспадарамі.

А вечарам, пасля багатага гасцявання, чакала яшчэ адна прыемнасць — вясковыя танцы на шырокім поплаве. Моладзь рыхтавалася да іх таксама загадзя — у складчыну наймала музыкаў, ладзіла танцавальнае кола. Яго ў нашых Баярах абавязкова абсаджвалі маладым маем — так называлі ў нас бярозкі. Рабілі як мага большае, бо танцавальных ахвотнікаў было, вой, колькі. А калі да іх далучаліся і мы, малеча, то не хапала і кола, танцавалі па ўсім поплаве. Да самай раніцы не змаўкалі ні гармонік, ні петыя-перапетыя песні, ні вясёлая гамана.

ТАКІЯ вось некаторыя штрыхі маёй дарогі да храма. Той дарогі, з якой, прызнаюся, я не збочваў ніколі — ні ў дзяцінстве, ні ў камсамольскія студэнцкія гады, ні падчас адказнай дзяржаўнай работы.

Анатоль БУТЭВІЧ.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

В настоящих правилах проведения Рекламной игры «Лето призов в Виталюр!» (далее – Правила) нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

Карта «Виталюр» – идентификатор (инструмент) участника программы лояльности ОДО «Виталюр» в виде активной пластиковой карты лояльности «Виталюр» с нанесенным на нее уникальным идентификационным номером «Виталюр» (далее – Номер карты «Виталюр»), эмитированной ОДО «Виталюр», в том числе для функционирования программы лояльности ОДО «Виталюр».

Карта «Моцная картка» – идентификатор (инструмент) участника программы лояльности ОДО «Виталюр» в виде активной пластиковой карты «Моцная картка» с нанесенным на нее уникальным идентификационным номером (далее – номер карты «Моцная картка») и зарегистрированной в системе Программы лояльности ОДО «Виталюр», эмитированной ОАО «Белинвестбанк», ОАО «Белагропромбанк», ОАО «БПС-Сбербанк», ЗАО «Идея-Банк», ОАО «Банк БелВЭБ», ЗАО «Альфа-Банк», ЗАО «БСБ Банк», ОАО «Технобанк», ОАО «Паритетбанк», ЗАО «Банк «Решение», ЗАО «РРБ-Банк», в том числе для функционирования программы лояльности ОДО «Виталюр».

Персональные данные – совокупность личных данных физического лица, которые необходимо зарегистрировать (или проверить) на Интернет-сайте www.vitalur.by, а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, при наличии);
- дата рождения (обязательно);
- адрес пребывания/проживания в Республике Беларусь: населенный пункт (обязательно), улица (обязательно, при наличии);
- адрес электронной почты (обязательно);
- абонентский номер мобильного телефона Участника в сети белорусского оператора сотовой связи в международном формате (обязательно).

Интернет-сайт – www.vitalur.by

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «ЭфСиБи Бел» (далее – Организатор), УНП 193185741.

Юридический адрес: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Козлова, 25, пом. 22.

Электронный адрес: info_igra@vitalur.by

2. Наименование Рекламной игры: «Лето призов в Виталюр!»

3. Территория проведения Игры: магазины «Виталюр» на территории Республики Беларусь (далее – магазины «Виталюр»).

4. Срок начала и окончания Рекламной игры, включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Рекламной игры: с 02 июня 2021 года по 31 августа 2021 года.

5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры:

Председатель комиссии:

Кривоногова Надежда Александровна – ведущий специалист по работе с клиентами ООО «ЭфСиБи Бел».

Члены комиссии:

Казак Вадим Анатольевич – специалист по рекламе ООО «Адверком»;

Бакач Татьяна Николаевна – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел»;

Корпик Екатерина Игоревна – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел»;

Страх Александра Вадимовна – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел».

6. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра: товары, перечисленные в *таблице 1* настоящего пункта (далее – Игровой товар), реализуемые в магазинах «Виталюр» на территории Республики Беларусь в период с 02 июня 2021 года по 28 июля 2021 года включительно.

Таблица 1

Игровые товары

№	Наименование Игрового товара
1	Мармелад жевательный FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА «Медвежата» 150 г
2	Мармелад жевательный FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА «Звери Mix» с вкусом апельсина, яблока, лимона, клубники, малины 150 г
3	Мармелад жевательный FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА «MOOEYS»/«Мууз» с молоком и фруктовым соком 138 г
4	Мармелад жевательный FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА «YO!RMS»/«Юрмс» с молоком и фруктовым соком 138 г
5	Мармелад жевательный FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА Звери Mix со вкусом апельсина, яблока, лимона, клубники, малины 70 г
6	Мармелад жевательный FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА Медвежата со вкусом апельсина, яблока, лимона, клубники 70 г
7	Мармелад жевательный FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА «Сочный арбуз» 70 г
8	Мармелад жевательный FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА «Tempties» в йогуртовой глазуре 100 г
9	Мармелад жевательный FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА «Tempties» в йогуртовой глазури со вкусом малины, клубники 35 г 120 шт.
10	Мармелад жевательный FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА 52 г
11	Мармелад жевательный FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА Крутой микс 850 г
12	Конфеты жевательные FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА мини мультипак ассорти 88 г
13	Конфеты жевательные FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА Ассорти со вкусом клубники, апельсина, лимона 41 г
14	Конфеты жевательные FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА со вкусом клубничного йогурта 41 г
15	Конфеты жевательные FRUIT-TELLA/ФРУТТЕЛЛА Радуга 70 г
16	Ирис MELLER соленая карамель 38 г
17	Ирис MELLER с шоколадом 38 г
18	Жевательная резинка CHUPA CHUPS вкус тутти-фрутти Сладкая вата Bubbly 11 г
19	Жевательная резинка CHUPA CHUPS «Биг Бабол» со вкусом клубники 21 г
20	Мармелад жевательный CHUPA CHUPS «Роллсы» с апельсиново-лимонным вкусом 70 г
21	Мармелад жевательный CHUPA CHUPS «Роллсы» с апельсиново-лимонным вкусом 150 г
22	Мармелад жевательный CHUPA CHUPS «Фансы» с фруктовым вкусом 150 г
23	Мармелад жевательный CHUPA CHUPS «Вомв» с фруктовым вкусом 120 г
24	Экструдированный мармелад CHUPA CHUPS» «Страйпсы» со вкусом клубники 120 г
25	Чай CURTIS Blue Berries Blues 20*1,8 г
26	Чай CURTIS Delicate Mango 20*2,5 г
27	Чай CURTIS French Truffle с/я 20*1,8 г
28	Чай зеленый CURTIS Fresh Mojito ароматизир. с цедрой цитрусовых и ароматом мохито байховый китайский высший сорт пакетированный в пирамидках 20*1,7 г
29	Чай CURTIS Isabella Grape ароматизир. с лепестками цветов, кусочками и ароматом винограда байховый цейлонский высший сорт пакетированный в пирамидках 20*1,8 г
30	Чай CURTIS Strawberry Mojito 20*1,8 г
31	Напиток чайный фруктово-травяной CURTIS Summer Berries с ароматом малины высший сорт пакетированный в пирамидках 20*1,7 г
32	Чай CURTIS Sunny Lemon ароматизир. с цедрой цитрусовых, лепестками цветов и ароматом лимона байховый цейлонский высший сорт листовой пакетированный в пирамидках 20*1,7 г
33	Напиток БЕЛА-КОЛА Классик газированный 0,5 л/бут.
34	Напиток БЕЛА-КОЛА Классик газированный 1 л/бут.
35	Напиток БЕЛА-КОЛА Классик газированный 2 л/бут.
36	Напиток БЕЛА-КОЛА АПЕЛЬСИН газированный 1 л/бут.
37	Напиток БЕЛА-КОЛА Апельсин газированный 2 л/бут.
38	Напиток БЕЛА-КОЛА Vanilla (ПЭТ) 2 л/бут.
39	Вода минеральн. НАБЕГЛАВИ (ст/бут) 0,5 л
40	Вода минеральн. НАБЕГЛАВИ (ПЭТ) 0,5 л
41	Вода минеральн. НАБЕГЛАВИ (ПЭТ) 1 л
42	Вода минеральная НАБЕГЛАВИ LIME аром. газир. (ж/б) 0,33 л
43	Вода минеральная НАБЕГЛАВИ GRAPEFRUIT аром. газир. (ж/б) 0,33 л
44	Квас АЛІВАРЫЯ «Аліварскі квас чорны «Dark Side» (ж/б) 0,45 л
45	Квас АЛІВАРЫЯ «Аліварскі квас чорны «Dark Side» (пэт-бут) 1 л
46	Квас АЛІВАРЫЯ «Аліварскі квас чорны «Dark Side» (пэт-бут) 1,5 л
47	Квас АЛІВАРЫЯ «Аліварскі квас чорны «Dark Side» (пэт-бут) 2 л
48	Квас АЛІВАРЫЯ «Аліварскі (пэт-бут) 1,0 л
49	Квас АЛІВАРЫЯ «Аліварскі» (ПЭТ) 1 л
50	Квас АЛІВАРЫЯ «Аліварскі» (ПЭТ) 1,5 л
51	Квас АЛІВАРЫЯ «Аліварскі» (ПЭТ) 1,5 л
52	Квас АЛІВАРЫЯ «Аліварскі» ПЭТ бут. 2 л
53	Квас АЛІВАРЫЯ «Аліварскі» ПЭТ бут. 2 л
54	Семечки подсолнечника ОТ МАРТИНА «Премиум» жареные отборные 100 г
55	Семечки подсолнечника ОТ МАРТИНА «Премиум» жареные отборные 100 г
56	Семечки подсолнечника ОТ МАРТИНА «Премиум» жареные отборные 200 г
57	Семечки подсолнечника ОТ МАРТИНА «Премиум» жареные отборные 200 г
58	Семечки подсолнечника ОТ МАРТИНА жареные соленые белые 100 г
59	Семечки подсолнечника ОТ МАРТИНА жареные с морской солью отборные 100 г
